# АНТЫВЕЛІКОДНАЯ КАМПАНІЯ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ Ў 1920-х гг.

**Казлова Настасся Іванаўна**
студэнт 4 курса гістарычнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны (г. Гомель, Беларусь)

Савецкая ўлада адным з важных пунктаў сваёй унутранай палітыкі аб'явіла выкараненне "перажыткаў мінулага", пад якімі ў першую чаргу разумела рэлігію. Важнае месца ў гэтым кірунку адводзілася змяншэнню ўплыву на грамадства праваслаўнай царквы, як буйнейшай канфесіі ў СССР. Адпаведна, у першую чаргу гэтая барацьба заключалася ў выцясненні праваслаўнай царквы з грамадскай сферы. І, паколькі за кароткі тэрмін прымусіць людзей адмовіцца ад рэлігіі, якая аказвала значны ўплыў на іх светапогляд, было складана, дзяржаўныя органы імкнуліся замяніць яе новай ідэалогіяй, выражэннем якой павінна была стаць новая "сацыялістычная" або "чырвоная" абраднасць. Так, з пачатку 1920-х гг. улада пачынае праводзіць новыя святы, напрыклад, "чырвоны Вялікдзень", "чырвонае Раство", якія суправаджаліся масавымі агітацыйнымі дзеяннямі і прапагандысцкімі мерапрыемствамі. Сцэнарыі свят з антырэлігійным утрыманнем складаліся з мітынгаў, вулічных масавых маніфестацый, падчас правядзення якіх характэрнымі рысамі было спальванне крыжоў, пудзіла Бога і папоў, і г.д.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца аналіз і выяўленне асаблівасцей правядзення антывелікоднай кампаніі на Гомельшчыне ў 1920-х гг Тэрытарыяльныя рамкі даследавання адпавядаюць мяжы Гомельскай акругі 1920-х гг Храналагічныя рамкі абраны не выпадкова, бо менавіта на працягу 1920-х гг. распрацоўваўся і выкарыстоўваўся той варыянт кампаній супраць рэлігійных святаў, які ўжываўся на працягу наступных дзесяцігоддзяў. Пры даследаванні дадзенай праблематыкі былі выкарыстаны архіўныя матэрыялы з Дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Гомельская вобласці [1–8].

Гомельшчына ў пачатку 1920-х гг. уяўляла сабой шматканфесійны рэгіён прадстаўлены праваслаўнымі, каталікамі, іўдзеямі, пратэстантамі і стараверамі. Да прыходу да ўлады бальшавікоў жыццё насельніцтва было прасякнула рэлігійнымі ўяўленнямі. Наступленне на рэлігію новымі ўладамі актыўна стала ажыццяўляцца ў форме "антырэлігійных свят". Асабліва ўважліва савецкае кіраўніцтва праводзіла антывелікодную кампанію, паколькі гэтае свята з'ўлялася важным для веруючых розных канфесій. Фактычна ў рэгіёне праводзілася дзве кампаніі: супраць іўдзейскага і супраць хрысціянскага Вялікадня. У дадзеным даследаванні будзе разгледжана кампанія менавіта супраць апошняга, у яго праваслаўным варыянце.

Падрыхтоўку да агітацыйнай кампаніі органы савецкай улады звычайна пачыналі за месяц, або нават раней да свята. У акругкомы і райкомы дасылаліся спецыяльныя пастановы, у якіх даваліся канкрэтныя рэкамендацыі па разгортванні лекцыйнай работы, распаўсюджванню пэўнай літаратуры, размяшчэнню антывелікодных артыкулаў у сродках масавай інфармацыі. Пра-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вядзенне самой кампаніі пачыналася за два тыдні да Вялікадня і заключалася ў арганізацыі шэрагу дакладаў антырэлігійнага характару. Размовы і лекцыі праводзіліся на заводах, фабрыках, калгасах, у клубах, хатах-чытальнях і г.д. Галоўным чынам, гэта былі лекцыі на навуковыя тэмы: паходжанне Вялікадня ў культурна-гістарычным аспекце; цуды звязаныя з Вялікаднем, іх навуковае тлумачэнне і г.д. Лектарамі выступалі партыйна-камсамольскія сілы, а таксама навуковыя працаўнікі, настаўніцтва, аграномы і інш. Адным з лозунгаў антырэлігійнай прапаганды з'яўлялася замена рэлігійных свят агульнадзяржаўнымі, выхад у дні Вялікадня на працу, адмова ад наведвання культавых устаноў, ад правядзення святочных рэлігійных абрадаў і г.д.

Антырэлігійная агітацыя праводзілася сярод розных груп насельніцтва як у горадзе, так і ў вёсцы. Сярод гараджан на ўсіх прадпрыемствах, фабрыках, заводах, клубах праводзіліся сходы на якіх ставіліся пытанні аб характары правядзення антывелікоднай кампаніі [6, арк. 51]. Рабочы працэс арганізоўваўся так, каб адцягнуць па магчымасці ўсіх працоўных ад хатняга святкавання і прыцягнуць іх у клубы і тэатры. У першыя дні Вялікадня ва ўсіх клубах уладкоўвалі клубныя вечары на якіх былі прадстаўлены: кіно, светлавыя карціны, жывая газета, канцэрты, спектаклі і г.д. [4, арк. 133]. Рабочым прапаноўваўся выхад на працу ў велікодныя дні з кампенсацыяй на майскія святы 2-мя днямі. Трэба адзначыць, што ў перыяд антывелікоднай кампаніі дзейнічалі так званыя палітсуды, на якіх разглядаліся справы над рабочымі і членамі іх сем'яў за правядзенне Вялікадня [6, арк. 52].

Для ажыццяўлення антырэлігійных, у тым ліку і антывелікодных мерапрыемстваў у вёску, дзе пазіцыі ўлады былі слабейшыя, накіроўваліся сябры кампартыі. Так, у газеце "Селянін" за май 1927 г. быў размешчаны артыкул, які характарызуе падрыхтоўку агітатараў: "Кандыдат КП(б) Б тав. Пазняк А. забраўся ў глухую вёску Бук і цэлыя святы 3 дні праводзіў пад чаркай самагонкі. Я думаю, такія камуністы няхутка выведуць нашу цёмную вёску з рэлігійнага дурману" [5, арк. 312].

Трэба адзначыць, што ўводзілася і так знаваная "камсамольская ўсяночная". Арганізоўвалі яе звычайна ў клубах, а ў 12 гадзін ночы ўдзельнікі ўсяночнай з факеламі праводзілі дэманстрацыю [2, арк. 171]. Асаблівая ўвага звярталася на правядзенне антывелікоднай кампаніі сярод жанчын. Іх прыцягвалі на ўсе мітынгі, палітсуды, гутаркі і вечары шляхам індывідуальных запрашэнняў, размеркаванні сярод іх квіткоў і г.д. [1, арк. 5]. Таксама, асобна праводзілася кампанія і сярод школьнікаў. Задача кампаніі: "праз школьнікаў перанесці ў сям'ю і грамадства навуковае паняцце пра Вялікдзень, як свята пакінутае ў спадчыну ад перажыткаў мінулага, як вынік цемры і невуцтва" [7, арк. 53–54].

Антывелікодная кампанія не мела таго поспеху, на які разлічвала савецкая ўлада. Насельніцтва працягвала адзначаць Вялікдзень. Так, рабочыя фабрыкі "Везувій" у 1930-м г. казалі: "Сёння і заўтра ва ўсіх клубах устройваюцца вечары з танцамі. Такія вечары ж часта бываюць у клубах, а ў царкве служба бывае раз на год, так лепш пойдзем у царкву" [8, арк. 331]. Таксама недастатковая падрыхтаванасць антырэлігійных агітатараў прадвызначыла лёс кампаніі [3, арк. 102–103]. Так, на запалкавай фабрыцы "Везувій" у 1930-м г. дакладчык паказ-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ваючы аўдыторыі шкоднасць велікодных свят, заявіў: “Яўрэі пры святкаванні Вялікадня выпякалі мацу, у якую дадавалі кроў рускіх”. Гэта прывяло да масавых абурэнняў з боку рабочых, і ён, бачна жадаючы супакоіць іх, працягваў: “раней рускія таксама забівалі рускіх і кроў ужывалі на афарбоўку яек”. Аднак, гэта вызвала яшчэ большае абурэнне і дакладчык быў змушаны прыпыніць свой выступ і пайсці [8, арк. 328].

Нягледзячы на ўсе захады савецкай улады, накіраваныя на выцясненне рэлігійных абрадаў і традыцый, кардынальна змяніць сітуацыю ў 1920-х гг. ва ўлады не атрымалася. У разглядаемы перыяд насельніцтва працягвала святкаваць Вялікдзень [4, арк. 133]. Больш ахвотна новую сістэму каштоўнасцей прымала моладзь, аднак гэты працэс у 1920-я гг. толькі пачынаўся.

**Літаратура**


1. Гомельскому женотделу РКП (б) // Государственный архив общественных объединений Гомельской области (ГАГООГО). – Ф. 2. Оп.1. Д.500. Л. 5.
2. Отчет Агитпропа Клинцовского Укома РКП (б) Б с 20 марта по 25 июля 1923 г. // ГАООГО. – Ф. 1. Оп. 1. Д. 1844. Л. 169–171.
3. Протокол совещания бюро городских партячеек от 31-го марта 1928 г. // ГАГООГО. – Ф. 3. Оп. 1. Д. 352. Л. 102–103.
4. Інформация о проведении антипасхальной кампании 18 апреля 1928 г. // ГАГООГО. – Ф. 3. Оп. 1. Д. 352. Л. 133.
5. Информация “Коммунист на пасху” в газете “Селянін” // ГАГООГО. – Ф. 4286. Оп.1а. Д.37. Л. 312.
6. План проведения Антипасхальной кампании // ГАГООГО. – Ф. 5. Оп. 1. Д.601. Л. 51–52.
7. Копия Зав. школами гор. Гомеля. О проведении антирелигиозной компании в школах в связи с религиозным праздником Пасхи // ГАГООГО. – Ф. 5. Оп. 1. Д. 601. Л. 53–54.
8. Специальная сводка № 36 Гомельского окружного отдела ГПУ БССР «Об отмеченных недочетах общественных организаций в проведении антирелигиозной кампании и отражении пасхальных дней в рабочей среде» // ГАГООГО. – Ф. 3. Оп. 1. Д. 714. Л. 328–331.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова